# КАНФЛІКТ НА ВУЛІЦЫ НАБЯРЭЖНАЙ,

## або Чаму мясцовая жыхарка «змагаецца» супраць маладых аднавяскоўцаў

**Не мной сказана: населены пункт, дзе закрываецца школа, не мае далейшай перспектывы. У аграгарадку Хатляны Уздзенскага раёна звіняць вясёлымі галасамі сярэдняя школа, дзіцячы сад. Тут пражывае шмат маладых сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей. Вядома, для іх важна, каб у вёсцы былі не толькі ўстановы адукацыі, але і аб'екты сацыяльнай, культурнай сферы. У Хатлянах працуюць Дом культуры, бібліятэка, урачэбная амбулаторыя, гандлёвы цэнтр, магазін. І, вядома ж, маладыя людзі, якія пабраліся шлюбам або яшчэ плануюць, хочуць мець сваё жыллё, каб не мыкацца па чужых кутах. Гэта добра разумеюць мясцовыя ўлады.**

У 2014 годзе Хатлянскі сельвыканкам прыняў рашэнне выдзеліць тры свабодныя зямельныя ўчасткі на вуліцы Набярэжнай для будаўніцтва дамоў маладым сем'ям, якія стаяць на чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў. Падкрэслю: не дачнікам, а сваім дамарошчаным жыхарам. Але, каб прапанаваць зямлю, мала толькі рашэння сельвыканкама. Трэба ўсё ўзгадніць з шэрагам службаў, райвыканкамам. Усе гэтыя працэдуры пройдзены паспяхова.

У Святланы Кныш з мужам трое дзяцей. Яны зарэгістраваны ў Хатлянах, але не маюць ва ўласнасці асобнай кватэры або дома. Святлана кажа, што бацькі ім не могуць дапамагчы будаваццa — у іх няма на гэта сродкаў. Застаецца спадзявацца толькі на сябе і дзяржаву, якая выдзеліла шматдзетнай сям'і субсідыю. «З дня на дзень чакаем паступлення сродкаў і будзем працягваць будаўніцтва», — кажа Святлана.

Але, як прызналася маладая жанчына, неяк няўтульна яна сябе адчувае, бо мясцовая жыхарка Таццяна Сухарэвіч пагражае, што прыкладзе ўсе намаганні, каб спыніць гэтае будаўніцтва.

Побач з сям'ёй Кныш ужо ўзвялі фундаменты і прыступілі да ўладкавання сцен дамоў сем'і Шавеляў і Фёдаравых.

— Мы будуемся сваімі сіламі. Канешне, цяжкавата. Але сваё жыллё патрэбна. Я адсюль родам, хачу тут жыць і гадаваць сваіх дзяцей, — падкрэслівае Аляксандр Шавель. — Разам з тым вельмі цяжка даводзіцца ў той нервовай абстаноўцы, якую стварае на пустым месцы Таццяна Васілеўна.

Як сцвярджаюць сем'і, з яе боку гучаць пагрозы. Нават быў выпадак, калі спыняла іх дзяцей-школьнікаў і казала, што іх бацькі няправільна робяць, загадвала пагутарыць з дарослымі. «Мы збіраліся падаць на яе ў суд, наняць адваката, ды перадумалі: нягожа сварыцца. Нам, землякам, варта жыць у ладзе і згодзе», — кажуць мае суразмоўцы.

Але не атрымліваецца. Чаму ж устаўляе палкі ў колы маладым аднавяскоўцам Таццяна Сухарэвіч? Я накіравалася да жанчыны, каб выслухаць яе пазіцыю.

У сваю кватэру Таццяна Васілеўна не пусціла. Зрэшты, яна як уласніца, мае на гэта права. Жанчына павяла мяне па вуліцах аграгарадка. На яе думку, тут усё няправільна, абы як спраектаваны вуліцы, дрэнныя тратуары, вада з кранаў «чорная», а ў тым месцы, дзе будуюцца маладыя сем'і, наогул не павінна быць жылых дамоў. Маўляў, трыццаць гадоў таму тут месціўся пясчаны кар'ер, затым яго пераўтварылі ў звалку і жывёльны могільнік. На першы погляд, Таццяна Васілеўна нібыта клапоціцца аб здароўі і бяспецы маладых аднавяскоўцаў. Але ж і яе недабудаваны дом стаіць літаральна цераз дарогу ад таго «гіблага» месца.

Спыняю маладую жанчыну, што спяшаецца па сваіх справах. Гэта медсястра мясцовай урачэбнай амбулаторыі Іна Бань.

— Вада ў нас сапраўды не з лепшых. Але не скажу, што яна брудная. Проста ржавая. Не заўсёды, але часам бывае. Кіпяцім, адстойваем або купляем бутыляваную.

Ва Уздзенскім раёне, дарэчы, як і ў многіх рэгіёнах Беларусі, у вадзе ўтрымліваецца жалеза, якое надае ёй чырванаватае адценне. «У нас якасць вады на кантролі, — запэўніў **старшыня раённага Савета дэпутатаў Ігар ПЯТРОВІЧ**. — Рэканструявалі станцыю абезжалезвання ва Уздзе. Вядуцца падрыхтоўчыя работы для ўладкавання такіх аб'ектаў у вёсках Возера, Дзешчанка, Каралёва. У перспектыве плануецца станцыя і ў аграгарадку Хатляны.

Але вернемся да размовы з Інай Бань:

— Правільна, што гэтыя ўчасткі выдзелілі маладым сем'ям. Там прыгожае, узвышанае месца. Я была б не супраць, каб там жыла мая дачка.

— Але ж там знаходзілася звалка, — пярэчыць Таццяна Сухарэвіч.

— Нешта я не прыпомню такога, — парыруе жанчына. — Мы там раней саджалі бульбу, пасвілі кароў.

— Ты нічога не разумееш, Іна. Калі там з'явіцца жыллё, то будуць парушаны ўсе санітарныя нормы...

— У кожнага гаспадара запланаваны індывідуальны ізаляваны каналізацыйны калодзеж. Упэўнена, што ніякай шкоды не будзе навакольнаму асяроддзю і людзям, — катэгарычна выказвае медык.

Дарэчы, Таццяна Сухарэвіч дасылае водгукі, як пад капірку, скаргі ў розныя інстанцыі. У Хатляны пастаянна едуць праверкі, камісіі, трацяцца дзяржаўныя сродкі на бензін, білеты, выплату камандзіровачных, перапіску. Не выявілі ніякіх парушэнняў раённыя, абласныя санітарная, экалагічная, архітэктурная службы, што пацверджана афіцыйным заключэннем.

Гэта і зразумела: пасёлак будаваўся для людзей, якія будуць працаваць і абслугоўваць буйны свінагадоўчы комплекс. І калі там сапраўды экалогія не адпавядала б нормам, то ніхто не даў бы згоды на будаўніцтва. Ды і самі б людзі не наладзіліся, калі для іх гэта небяспечна.

Таццяна Сухарэвіч сцвярджае: паводле генеральнага плана развіцця Хатлян, які нібыта ад жыхароў хаваюць, на месцы ўчасткаў павінна быць царква і водаправод.

Але ж у Хатлянах ёсць прыгожы храм, аздоблены ў блакітных колерах, купалы якога велічна ўздымаюцца ў такое ж блакітнае неба. Стаіць ён на ўзвышшы і бачны з любой кропкі аграгарадка. У гэтай святыні нязросты лёс. Унікальны пяцікупальны храм-помнік драўлянага дойлідства пабудаваны ў канцы XIX стагоддзя па тыпавым праекце вядомага рускага архітэктара Канстанціна Тона. Цягам часу царква разбуралася. У 90-х гадах мінулага стагоддзя ад яе засталіся амаль што руіны. Падчас будаўніцтва свінакомплексу і паралельна з ім жылога пасёлка паўстала пытанне аб узвядзенні новай царквы або рамонце і рэстаўрацыі старой. Перавагу аддалі апошняму варыянту. Дзякуючы кіраўніцтву свінакомплексу «Белая Русь», тагачаснаму калгасу «Дружба» і спонсарскай дапамозе камерцыйных арганізацый, святыню аднавілі. Але ў ноч на 6 студзеня 2013 года царква Пакрова прасвятой Багародзіцы згарэла. Трэцяе жыццё ёй далі вернікі, якія сабралі грошы на аднаўленне. У лістападзе гэтага года храм асвяціў епіскап Маладзечанскі Павел.

Так што, прыхаджанам ёсць дзе памаліцца, ёсць дзе раскрыць душу Богу. А што датычыцца Таццяны Сухарэвіч, то 19 мая гэтага года Мінаблвыканкам спыніў з ёй перапіску.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

*lazovskaya@zviazda.by*

### ❍ КАМЕНТАРЫЙ З НАГОДЫ

**Тамара ЛЯСНЕЎСКАЯ, старшыня Хатлянскага сельвыканкама:**

— Агульнага Генеральнага плана развіцця Хатлян у нас няма. У 1986 годзе падчас будаўніцтва свінагадоўчага комплексу прынятае рашэнне стварыць жылы пасёлак для спецыялістаў і работнікаў прадпрыемства. Быў распрацаваны план пасёлка, які будуецца, ён распаўсюджваўся на дзве вуліцы: Цэнтральную і Першую. Планавалася пабудаваць тут таксама дзіцячы сад, гандлёвы цэнтр і два інтэрнаты. У той час я працавала ў будаўнічай арганізацыі, якая ўзводзіла жывёлагадоўчы аб'ект, і бачыла праектную дакументацыю. Генплан, як сцвярджае Таццяна Васілеўна, не прадугледжваў больш ніякіх забудоў. Усё астатняе было выдзелена праектнай дакументацыяй дэтальнай планіроўкі індывідуальных пабудоў па кожнай вуліцы асобнымі ўчасткамі. Для ўчастка, пра які згадвае Таццяна Васілеўна, план прадугледжваў ушчыльненне існуючай забудовы. Што датычыцца звалкі, то я неадночы размаўляла з мясцовымі жыхарамі. Яны згадвалі, што там быў невялікі кар'ер, але ніякай звалкі там ніхто не памятае. Пасля заканчэння будаўніцтва кар'ер засыпалі.

### ❍ КАМЕНТАРЫЙ З НАГОДЫ

**Іван ЛІПНІЦКІ, старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў:**

— Я з'яўляюся дэпутатам па Уздзенскай выбарчай акрузе. У курсе прэтэнзій Таццяны Васілеўны. Неаднаразова выязджаў на месца, разбіраўся ў гэтым пытанні. Азнаёміўся з дакументацыяй, якую вёў сельскі Савет дэпутатаў, раённы Савет дэпутатаў, райвыканкам, Мінаблвыканкам. Паводле Закона «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні ў Рэспубліцы Беларусь» ад 4 студзеня 2010 года №108-З яны рабілі ўсё як належыць. Адна-дзве асобы, якія не згодны з рашэннямі большасці, усё ж павінны ёй падпарадкоўвацца. Ёсць закон, яго трэба выконваць. Сем членаў сельвыканкама прагаласавалі за тое, каб выдзеліць маладым людзям участкі пад жыллёвае будаўніцтва, бо яны мелі патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў і стаялі на чарзе. І калі паступіла скарга ў райсавет, каб ён адмяніў рашэнне аб выдзяленні зямлі маладым сем'ям, 25 дэпутатаў раённага Савета дэпутатаў не падтрымалі патрабаванні заяўніцы.

Яны зрабілі ўсё па законе. Улічваючы заключэнні санітарнай, экалагічнай службаў, іншых кантрольных органаў, што зямля прыдатная да эксплуатацыі, менавіта пад жыллёвую забудову і прысядзібныя ўчасткі, лічу, усе пытанні знятыя. Асабіста, як старшыня абласнога Савета дэпутатаў, не магу ўпікнуць мясцовыя распарадчую і заканадаўчую ўлады, што яны парушылі закон. Усё было адкрыта, галосна, падчас калегіяльнага абмеркавання.

Закон «Аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб» ад 18 ліпеня 2011 года №300/З у выпадку неабгрунтаваных скаргаў дазваляе падаць іск у суд аб вяртанні затрат. Але на практыцы гэтым ніхто не скарыстаўся. На маю думку, варта было б перагледзець некаторыя артыкулы гэтага закона. Дакумент дапамог мільёнам людзей вырашыць свае праблемы. Але засталіся адзінкі, якія ва ўсе часы хадзілі па розных інстанцыях, ствараючы сабе імідж і піяр. І ходзяць цяпер. Трэба смялей спыняць з імі зносіны, калі іх дзеянні супярэчаць заканадаўству. Лічу, варта ўнесці ў дакумент папраўкі, каб зрабіць яго больш жорсткім для асоб, што не даюць спакою людзям, прадстаўляюць уладу як нейкага ўтрыманца, які не клапоціцца пра дабрабыт грамадзян.


## Извещение о проведении торгов

18 января 2018 года в 11.00 в здании Щучинского районного исполнительного комитета, расположенного по адресу: Гродненская область, Щучинский район, город Щучин, площадь Свободы, 11, состоится аукцион по предоставлению поверхностных водных объектов, расположенных на территории Щучинского района Гродненской области, в аренду для рыбоводства.

**Лот №1.** Поверхностный водный объект – пруд возле деревни Большие Козлы, расположенный на территории Щучинского района Гродненской области, площадью 24,97 га. Тип пруда речной-долинный. Установлена грунтовая плотина длиной 500 м с песчано-гравийным покрытием. Средняя глубина – 2,5 м, максимальная глубина – 4,8 м.

**Начальная цена объекта торгов – 46,00 (сорок шесть) рублей**

**Лот №2.** Поверхностный водный объект – пруд возле деревни Ошурки, расположенный на территории Щучинского района Гродненской области, площадью 2,83 га. Тип пруда речной-долинный. Установлена грунтовая плотина длиной 900 м с песчано-гравийным покрытием. Средняя глубина – 2,1 м, максимальная глубина – 3,5 м.

**Начальная цена объекта торгов – 46,00 (сорок шесть) рублей**

Задаток вносится в размере 20 процентов от начальной цены объекта торгов с подачей в комиссию заявления и составляет 9,20 (девять рублей двадцать копеек).

Принять участие в аукционе могут юридические лица и физические лица, в том числе индивидуальные предприниматели.

Для участия в аукционе в срок по 16 января 2018 года до 16.00 необходимо предоставить комиссии по организации и проведению аукциона, по адресу: Гродненская область, Щучинский район, город Щучин, площадь Свободы, 11, кабинет 65, следующие документы:

заявление на участие в аукционе с указанием сведений о поверхностном водном объекте, который участники торгов желают получить в аренду по результатам торгов;

заверенная банком копия платежного поручения, квитанции или иного документа, подтверждающего внесение суммы задатка на расчетный счет Щучинского районного исполнительного комитета BY29AKBB36045270000164000000 в ЦБУ 424 филиала №400 Гродненское областное управление ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Щучин, БИК: AKBBBY21400, УНП 500066573, ОКПО 04063954;

юридическим лицом – копии учредительных документов и копия свидетельства о государственной регистрации юридического лица;

физическим лицом – копия паспорта гражданина или иного документа, удостоверяющего личность;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя;

доверенность представителя участника торгов и копия документа, подтверждающего его личность (в случае, если заявление подписывается не участником торгов).

Затраты на организацию и проведение торгов (за публикацию извещения о проводимых торгах в средствах массовой информации) составили 194,40 (сто девяносто четыре рубля сорок копеек) и подлежат возмещению участником торгов, выигравшим торги, на расчетный счет Щучинского районного исполнительного комитета BY29AKBB36045270000164000000 в ЦБУ 424 филиала №400 Гродненское областное управление ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Щучин, БИК: AKBBBY21400, УНП 500066573, ОКПО 04063954, в течение пяти рабочих дней со дня проведения торгов.

Срок заключения по результатам торгов договора аренды поверхностного водного объекта для рыбоводства – 5 лет.

Адрес и номер контактного телефона секретаря комиссии: Гродненская область, Щучинский район, город Щучин, площадь Свободы, 11, кабинет 65, тел. (01514) 2 95 86.

## Управление принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома объявляет о проведении торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Россонский агросервис» (УНП 300172281)

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) имущества и его стоимость | Лот №1. Трактор К-701, 1993 г. в., г/н БХ3608 с установленной начальной ценой 3 634,20 рублей |
| Наличие обременений | Отсутствуют |
| Местонахождение имущества | Г. п. Россоны, ул. Лапенко, 36 |
| Место, дата и время проведения торгов | 26.12.2017 г. в 10.00<br>г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 2.3 |
| Справочная информация об организаторе торгов | Управление принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома (г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1).<br>www.vitebskjust.gov.by<br>Судебный исполнитель Деревнин Сергей Евгеньевич, тел./факс: (0212) 61 40 08, (033) 687 91 44 |
| Условия и порядок проведения торгов | Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано:<br>1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет управления принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома IBAN BY73AKBB36429030010372000000 в ф-ле 200 ОАО «АСБ Беларусбанк», BICAKBBBY21200, УНП 300002505, не позднее 17.00 22.12.2017.<br>Величина первого шага составляет 5 процентов от начальной стоимости выставленного на торги имущества (лота).<br>В соответствии со статьей 97 Закона Республики Беларусь «Об исполнительном производстве»возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги (покупателем) |

## ОАО «Дзержинский экспериментально-механический завод» проводит открытый аукцион по продаже имущества

| № Лота | Наименование | Начальная цена с НДС, руб. РБ | Сумма задатка (10% от первоначальной цены) с НДС, руб. РБ |
|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение (одноэтажное кирпичное здание, общей площадью 323,8 кв. м), расположенное по адресу: Минская область, г. Дзержинск, ул. Минская, 2 | 94 830 руб. 84 коп. | 9 483 руб. 81 коп. |
| 2 | Автомобиль фольксваген «Каравелла», 2006 г. выпуска, 2,5 DTI, мест 8+1, пробег370 тыс. км | 12 428 руб. 09 коп. | 1 242 руб. 02 коп. |

Задаток в размере 10% от начальной цены перечисляется на р/с BY580LMP30121000155410009 33 в ОАО «Белгазпромбанк» г. Минск, ул. Притыцкого, 60/2, код банка OLMPBY2X, МФО 153001742, УНП 600004946, ОКПО 05550337.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Аукцион состоится 9 января 2018 г. в 14.00 по адресу: Минская обл., г. Дзержинск, ул. Фоминых, 46. Заявление на участие и необходимые документы принимаются по 4 января 2018 г. до 12.00 по указанному адресу.

Контактные телефоны: 801716 54119; +375 44 554 45 25; тел./факс 8 01716 5-52-79.

УНП 600004946